СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ДА 35-ГОДДЗЯ З ДНЯ ВЫЗВАЛЕННЯ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ ● РАСКАЗВАЮЦЬ СТУДЭНТЫ ЮРФАКА ● ШОСТАЯ ТРАДЫЦЫЙНАЯ ● НАШЫ ВЫПУСКНІКІ ● СВЕТЛАЯ МУЗЫКА ДУШЫ ● ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ ● РАСКАЖУ АБ ТАВАРЫШУ: ЖЫВЕ ТАКІ ХЛОПЕЦ ● СПОРТ: ЗАКОНЧЫЛІСЯ СПАБОРНІЦТВЫ ПА ЛЁГКАЙ АТЛЕТЫЦЫ ● ТВОЙ ЭТЫКЕТ: ШТО ЗА СЛОВАМ?

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 19 (1245) ● 31 мая 1979 г. Цана 2 кап.

Зоймем не апошняе месца

Часта гавораць: «Інтэрнат — другі дом». І гэта сапраўды так. Мы прыходзім сюды, каб адпачыць, падрыхтавацца да заняткаў, правесці свой вольны час. Вялікае значэнне маюць тыя магчымасці, якія ёсць у інтэрната (у гэтых адносінах наш інтэрнат знаходзіцца ў менш спрыяльным становішчы, чым інтэрнат на Кастрычніцкай), але ж ад нас саміх залежыць утульнасць у пакоі і здаровая абстаноўка ў інтэрнаце. У гэтым лёгка пераканацца, калі зайсці ў пакоі № 314, 315, 427, 536. Сапраўды, заходзіш, як у свой дом: адчуваюцца дамашняя цеплыня і ўтульнасць. Сустракаюцца, праўда, і такія пакоі, у якія заходзіш, як у зал чакання на вакзале. Хочацца сказаць іх жыхарам: «Жывіце ў пакоі для сябе, а не для праверкі».

Добра працуюць у інтэрнаце спартыўны і культурна-масавы сектары. У штогадовым першынстве БДУ паміж інтэрнатамі па футболу, баскетболу, валейболу, шахматах і шашках каманды нашага інтэрната занялі першае месца. Культурна-масавы сектар арганізаваў сустрэчу з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, з артыстамі тэатра оперы і балета, з намеснікам пракурора г. Мінска. Цікава прайшлі вечары пытанняў і адказаў, арганізаваныя кафедрай філасофіі.

Шмат цёплых слоў хочацца сказаць у адрас Эльзы Аляксееўны Калінінай, якая перадала ў фонд інтэрната Поўны збор твораў У. І. Леніна. Студэнты, якія жывуць у інтэрнаце, атрымалі магчымасць працаваць з творамі У. І. Леніна не толькі ў бібліятэцы, але і ў ленінскім пакоі інтэрната.

Мы спадзяёмся, што ў сацыялістычным спаборніцтве інтэрнатаў г. Мінска наш інтэрнат зойме не апошняе месца.

Новы часопіс юрыстаў

Вясной 1979 года выйшаў першы нумар агульнасаюзнага навукова-тэарэтычнага часопіса «Праваznаўства». Адметнай рысай гэтага часопіса з'яўляецца тое, што ён прыўрочан да 60-годдзя ўтварэння БССР, а таксама тое, што аўтарамі ўсіх артыкулаў, навуковых паведамленняў і рэцэнзій з'яўляецца калектыў кафедраў юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта. Часопіс адкрываецца артыкулам намесніка дэкана на навуковай рабоце дацэнта І. А. Юхо, у якім асвятляецца гісторыя юрыдычнай навукі ў БССР за 60 гадоў.

Шэраг артыкулаў і паведамленняў прысвечаны праблемам дзяржаўна-прававога развіцця БССР (прафесар А. А. Галаўко, дацэнты Л. А. Прыходзька, Ю. П. Броўка, в. а. дацэнта Л. В. Паўлава, прафесары В. Ф. Чыгір, І. І. Гарэлік, І. С. Цішкевіч, дацэнты М. Ф. Сцепанко, Н. Н. Гапановіч, В. Г. Ціхіня, В. В. Сарокіна, выкладчык Г. А. Варабей. Артыкул дацэнта Э. А. Калінінай прысвечан праблемам паходжання і сутнасці права Індыі.

У часопісе ёсць рэцэнзіі на манаграфіі і артыкулы, апублікаваныя нашымі выкладчыкамі.

Публікацыі членаў калектыву выкладчыкаў юрыдычнага факультэта БДУ ў агульнасаюзным навукова-тэарэтычным прававым часопісе з'яўляюцца добрай адзнакай навукова-даследчай работы, якая вядзецца на факультэце.

(Насцengазета «Савецкі юрыст»).

Паход выхаднога дня

Першакурснікі фізічнага, геаграфічнага, біялагічнага і механіка-матэматычнага факультэтаў сталі ўдзельнікамі масавага паходу выхаднога дня, які арганізавалі клуб турыстаў універсітэта і кафедра фізічнага выхавання. Маршруты паходаў праходзілі па Мікалаеўшчыне, радзіме народнага паэта БССР Якуба Коласа, праз вёску Станькава Койданаўскага раёна, дзе нарадзіўся Герой Савецкага Саюза Марат Казей, праз гарадскі пасёлак Радашковічы, каля якога здзейсніў свой бессмяротны подзвіг Мікалай Гастэла. Удзельнікі паходу пад кіраўніцтвам старэйшых сяброў — вопытных турыстаў здалі нормы ГПА па турызму.

Наш кар.

ДА 35-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ

Слаўнай даце прысвячаецца

Выключна вялікая ўвага аддаецца на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнтаў. Сярод мерапрыемстваў, звязаных са святкаваннем 35-годдзя вызвалення Савецкай Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, асобае месца заняла навукова-тэарэтычная канферэнцыя выкладчыкаў і студэнтаў факультэта, прысвечаная гэтай слаўнай даце.

Адкрыў канферэнцыю прарэктар універсітэта па вучэбнай рабоце, прафесар У. Р. Івашын. «35 гадоў вызвалення Савецкай Беларусі» — такая тэма даклада дацэнта кафедры гісторыі БССР І. В. Марчанкі. Гераічнаму подзвігу воінаў Чырвонай Арміі пры вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, баявому ўзаемадзеянню беларускіх партызан з воінамі 1-га Беларускага фронту, удзелу студэнтаў горада Мінска ў Вялікай Айчыннай вайне прысвяцілі свае выступленні студэнты Т. Акуліч, Т. Курсевіч, Л. Жураўская.

На канферэнцыі выступіў ганаровы госць — старшыня Мінскай секцыі ветэранаў вайны генерал-маёр танкавых войск В. І. Сінчылін. Ён уручыў ветэранам вайны гістарычнага факультэта памятныя ўзнагароды Савецкага камітэта ветэранаў вайны і яго Мінскай секцыі.

Да канферэнцыі была прыўрочана кніжная выстаўка «Непераможная Беларусь».

ДА 35-ГОДДЗЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ Ў БАЛГАРЫІ

ШОСТАЯ ТРАДЫЦЫЙНАЯ

Традыцыйным стала ў БДУ правядзенне дзён балгарскай культуры, славянскай пісьменнасці і адукацыі, савецка-балгарскіх студэнцкіх навуковых канферэнцый.

Цяперашняя — шостая па ліку — была прысвечана 35-годдзю сацыялістычнай рэвалюцыі ў Балгарыі.

Адкрыў канферэнцыю прафесар Д. Б. Мельцар. Выступіўшыя на ёй з навуковымі дакладамі савецкія і балгарскія студэнты расказалі аб выніках 35-гадовага развіцця Народнай Рэспублікі Балгарыі па шляху сацыялізму, аб знешняй палітыцы краіны, удзеле балгарскай моладзі ў сацыялістычным будаўніцтве. Брацкай дружбе і цеснаму ўсебаковаму супрацоўніцтву савецкага і балгарскага народаў прысвяціў сваё выступленне студэнт II курса гістарычнага факультэта Мікалай Стаіменаў.

На канферэнцыі прысутнічала дэлегацыя Усенароднага камітэта балгара-савецкай дружбы на чале з сакратаром Габраўскага акруговага камітэта БКП Дзімітрам Мітковым.

На канферэнцыі дэманстравалася фотавыстаўка «Сацыялістычнай Балгарыі — 35 гадоў».

А. РУБАНАЎ.



Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна значную ўвагу аддае падрыхтоўцы навуковых кадраў. Нядаўна адбылося чарговае размеркаванне аспірантаў БДУ, на якім прысутнічалі намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР Ф. М. Капуцкі і іншыя прадстаўнікі міністэрства.

НА ЗДЫМКУ: аспірантка кафедры педагогікі Л. П. НАВІЦКАЯ ў час размеркавання.

Нашы выпускнікі

ШЧОДРАСЦЬ

ВЁСКІ бываюць розныя. Старажытныя і новыя, вялікія і малыя. Вёска, у якую я завітаў, знаходзіцца нейдзе паміж гэтымі полюсамі — сярэдняя на ўзрост, велічыню і прыкметнасць.

Носіць яна прывабную назву — Лелікава. Гэта цудоўны куток Беларусі, са сваімі модамі, звычкамі.

Вось у гэтую вёску і накіравалі на працу маладога спецыяліста-педагога Таццяну Аляксандраўну Сахарук.

— Першыя месяцы цяжка было,— уздыхнула Таццяна Аляксандраўна.— Першы ж год... І казалі раней: «Пабачым, як яна справіцца са сваёй работай...»

Затое цяпер я чуў іншыя думкі. Ведаеце, што цяпер гавораць? Нікога іншага нам не трэба...

Лелікаўскія педагогі хутка адчулі: у калектыў прыйшоў новы цікавы чалавек, сучасны педагог.

Вясна. Лёгкакрылы ветрык насіў-кружыў у паветры беларужовую квецень. Шчодра буялі, набіраліся сілы вясковыя сады, прачыналася ад сну зямля, прыўбіралася ў зелень першых, дружных усходаў.

Таццяна Аляксандраўна ўважліва ўглядалася ў дарогу, гулка білася сэрца. Яна спяшалася дадому.

«Яна ж не вытрымае,— думае Таццяна пра маці.— Добра, калі на прыпынку чакае, а то гатова і насустрач ісці. А колькі там таго здароўя, пастарэла ўжо...»

«Адна надзея на цябе, дачушка,— зноў прыйшлі на памяць Таццяне матчыны словы.—Кідай гэтую работу, знойдзеш сабе лепшую і дома»,— прасіла яна ў пісьме. «Не, на іншай я не змагу працаваць...» — разважала яна.

Ляжыць яе пасланне ў чамадане, а так шчыміць, трывожыць. У палоне думак-разваг не прыкмеціла, як прыйшла на прыпынак. Ледзь прывіталіся, а матуля адразу ў абдымкі. Цэлы вечар яны дзяліліся рознымі навінамі. Што ні кажыце, а маці і дачцы было аб чым гаварыць.

Добры дзень, дзеці!

Наўрад ці можна знайсці іншую назву прафесіі, якая б гучала так прыгожа, горда, пранікнёна, як слова «настаўнік».

М. І. Калінін гаварыў, што паняцце «настаўнік» мае два значэнні: у вузкім разуменні— гэта выкладчык; у шырокім сэнсе — аўтарытэтны, мудры чалавек, які аказвае велізарны ўплыў на людзей.

— Я лічу,— сказала Таццяна Аляксандраўна,— што стыль і ўзровень работы пачынаецца з самых строгіх і патрабавальных адносін да самога сябе.

— Можа гэта і так,— запярэчылі педагогі. — Толькі пачынаецца школа з настаўніка, з яго партыйнай адказнасці за будучыню краіны.

Іменна з гэтага і пачалося маё знаёмства з педагагічным калектывам школы. Атмасфера патрабавальнага даверу пануе тут.

...У прасторным школьным пакоі цішыня, якая бывае толькі ў час урока. У цішыні чутны роўны голас настаўніка. Таццяна Аляксандраўна уважлівым позіркам абводзіць клас. Ад яе ўдумлівых вачэй ніколі не схаваецца вучань, які не падрыхтаваў урок.

Настаўніца піша на дошцы дату, а пад ёю слова, якое асабліва хвалюе зараз хлопчыкаў і дзяўчынак 3-га класа: «Ізлажэнне». Цяпер яны дружна вымаўляюць усё напісанае ёю.

— Звярніце ўвагу: пасля літары «ж» стаіць літара «э». Паглядзіце таксама ўважліва, якое «і» вы напісалі.

Шмат пытанняў задае настаўніца. За кожным з іх настойлівае імкненне як мага лепш настроіць вучняў на гэта першае для іх беларускае ізлажэнне, засцерагчы ад памылак.

— Якое правіла мы вывучалі? Калі ласка, Андрэй!

— Парныя звонкія і глухія зычныя.

— Што трэба рабіць, каб не памыліцца ў іх напісанні?

Усім хочацца назваць свае праверачныя словы: грыб — грыбы, холад — халады...

Таццяна Аляксандраўна прапануе знайсці такія словы ў тэксце. А потым гаворыць:

— Я хачу звярнуць вашу ўвагу на слова «дзьме». «Д» у беларускай мове толькі цвёрдае, мяккасць яго перадаецца праз «дз». Аб гэтым мы будзем гаварыць на наступным уроку.

Настаўніца просіць Зіну Заяц прачытаць тэкст. І пытаецца ў вучняў, якія словы яна няправільна прачытала. Аказваецца, заўважылі: «пальто» замест «паліто», «валенкі» замест «валёнкі». Цяпер калектыўна вырашаюць, як падзяліць тэкст на дзве сэнсавыя часткі, якія даць загалоўкі.

— Ці ёсць незразумелыя вам словы?

Зіна Заяц просіць растлумачыць значэнне слова «вырай». Але тлумачыць не настаўніца — самі дзеці.

— Хто зможа перадаць сваімі словамі першую частку? — пытаецца Таццяна Аляксандраўна.

Узнімаецца Толя Хучко. За ім Аня Белая. Але яшчэ ўсім класам услых будуць яны чытаць загалоўкі, яшчэ не раз настаўніца засцеражэ: «Калі будзеце пісаць...» Нарэшце, папросіць:

— Прагаварыце ў думках першую частку,— і толькі потым дазволіць: — Пішыце...

Дзеці схіляюцца над сшыткамі, а яна прысядзе да стала, думаючы аб тым, што трэба па беларускай мове завесці «Экран памылак»...

(Працяг будзе)

А. МАРЧУК.

Над сваімі дыпломнымі працуюць у гэтыя дні студэнткі V курса хімічнага факультэта. Фота **М. Дубовіка.**

● Імянныя стыпендыяты

Ключык да кожнага...

Я заходжу у камітэт камсамола механіка-матэматычнага факультэта. Выглядае пакой яшчэ не вельмі прывабна. Вядома — навасселле. Вось і цяпер галовы дзяўчат схіліліся над сталом. Яны штосьці малююць, пішуць, аб нечым спрачаюцца, раяцца — хочацца хутчэй аформіць і ўсё даведаць да ладу.

Саша Казулін узначальвае камсамольскую арганізацыю факультэта, і ў яго заўсёды шмат работы. Бегатні хапае: то ў камітэт камсамола факультэта выклікаюць, то па справах трэба ў дэканат, то яшчэ што. Але ў блакітных вачах заўсёды іскрынкі задору, а на твары — добразычлівая ўсмешка. Сакратаром камсамольскай арганізацыі працуе Саша другі год, займаецца на выдатна — ленінскі стыпендыят. На пытанне «Ці не перашкаджае грамадская работа вучобе?» адказвае:

— Ведаеце, адно другому не перашкода. Толькі вось час распланоўваю амаль па хвілінах. Усё прыходзіцца рабіць адразу, без ніякіх раскачак.

На дзённае навучанне Саша Казулін перайшоў з вячэрняга аддзялення. Вопыт работы камсамольскага сакратара ў арміі, арганізатарскія здольнасці, уважлівасць і патрабавальнасць неяк адразу вылучылі яго сярод іншых.

— Яшчэ тады, калі Саша быў камісарам будатрада «Волаты»,— успамінае яго сябар камандзір гэтага атрада Іван Гром,— я заўважыў, што ў будучым з яго атрымаецца нядрэнны камсамольскі важак. Дзякуючы яму ў дзень адкрыцця лагера ў нас, як ніколі, панавала ўрачыстасць. Усё было афармлена на вышэйшым узроўні. Во такі ў Сашы характар: калі бярэцца за справу, то даводзіць яе да канца і робіць не абы-як, а з душой.

На факультэце больш тысячы камсамольцаў, і, вядома, з кожным асабіста не пазнаёмішся. Але Саша імкнецца да кожнага падабраць той запаветны ключык, які б дапамог раскрыць душу чалавека. Любяць і цэняць на факультэце сакратара камсамольскай арганізацыі. Для студэнтаў ён — прыклад спагадлівага і патрабавальнага, чулага і дзелавога чалавека.

Мінулым летам на радзіме Аляксандра Матросава камуністычны будатрад узводзіў помнік герою. У атрадзе былі студэнты з ВНУ Пскоўскай вобласці і Мінска, але іменна яму, Сашу Казуліну, было даручана ўзначальваць атрад. І камандзір справіўся са сваімі абавязкамі — камсамольцы выканалі пастаўленыя задачы.

Т. ГРЭЛЬ.

1 чэрвеня—Міжнародны дзень абароны дзяцей

У Савецкім Саюзе мы стараемся зрабіць усё, каб гады дзяцінства былі здаровымі і шчаслівымі. Мы стварылі і працягваем будаваць тысячы і тысячы светлых, зручных дзіцячых яслаў, дзіцячых садоў, школ. Мы імкнёмся навучыць дзяцей дабру, дружбе, навучыць іх жыць па-добрасуседску з усімі людзьмі любой нацыянальнасці і колеру скуры, навучыць іх паважаць працу і ўмець працаваць на карысць усіх людзей.

(Л. І. БРЭЖНЕЎ).

Светлая музыка душы

Я стала перабіраць стос пласцінак. Калекцыяй, безумоўна, зараз не здзівіш нікога. Музыкай цікавяцца амаль усе. Але нярэдка гэта становіцца проста жаданнем мець самыя сучасныя запісы, каб пахваліцца перад сябрамі, што, маўляў, ёсць апошні дыск «АББА» ці «Боні М». У Алега—салідная калекцыя твораў класічнай музыкі.

Бах, Бетховен, Моцарт, Чайкоўскі, Глінка... Гэта ўжо не проста даніна модзе, а музыка для душы, музыка, якую чалавек з захапленнем слухае і ў гадзіны радасці, і ў хвіліны інтымнага перажывання...

З Алегам можна спрачацца і размаўляць аб усім. Тэатр і спорт, жывапіс і літаратура, касманаўтыка і паэзія — гэта далёка не поўны пералік яго інтарэсаў. Любіць Чэхава, на факультэцкіх вечарах чытае вершы Вазнясенскага.

Галоўнае, што Алег цэніць у чалавеку—гэта сумленнасць і добразычлівасць. «Па-мойму, сумленны чалавек будзе добрым і шчырым, сапраўдным таварышам. У такіх людзей, як правіла, шырокае кола інтарэсаў, яны — аптымісты».

Можа выбар Алега Любіча таму і выпаў на юрфак, што хочацца бачыць усіх людзей іменна такімі.

З прафесіяй юрыста ён знаёмы яшчэ з дзяцінства. Яго бацька працуе адвакатам. Алег з цікавасцю слухаў расказы аб гэтай прафесіі, з захапленнем чытаў творы, прысвечаныя ёй. А галоўнае, за знешняй рамантычнасцю працы юрыста ён убачыў паўсядзённую, нялёгкую, але высакародную справу.

Зараз Алег на другім курсе. Ён робіць толькі першыя крокі ў сваю будучую прафесію. Але яны цвёрдыя, упэўненыя. Усе дні тыдня для яго — час, калі трэба нешта зрабіць, некуды паспяшыць. Пасля заняткаў— факультэцкая насценгазета і мастацкая самадзейнасць, работа ў студэнцкім навуковым таварыстве. Дарэчы, Алег з поспехам выступіў са сваім дакладам на універсітэцкай навуковай канферэнцыі, а потым яго з цікавасцю слухалі і на юрыдычным факультэце Рыжскага універсітэта.

Да таго ж, Алег Любіч сесіі здае толькі на выдатна. Сорамна прыходзіць на экзамен непадрыхтаваным, нават калі можна спаслацца на грамадскую работу... Таму нямала часу прыходзіцца працаваць у бібліятэцы.

Але хлопец знайшоў час, каб прыйсці да студэнтаў журфака, расказаць аб прыгажосці, класічнай адточанасці, сіле музыкі Баха, Шапэна, Штрауса... Пасля таго як вечар закончыўся, доўга яшчэ гучалі ў душы чароўныя акорды.

Светлая музыка душы — гэта вельмі добра, калі з ёю крочыць па жыцці чалавек.

Л. КЛАСКОЎСКАЯ,
студэнтка журфака.

Раскажу аб таварышу

Жыве такі хлопец

ІГОЛКА ціха дакранулася да пласцінкі і пачала ўзнаўляць апавяданне аб маладым беларускім горадзе Наваполацку, запісанае на адной з гукавых старонак часопіса «Кругозор».

Шмат цікавага аб першых будаўніках горада, аб цяжкасцях побыту, аб рамантыцы расказваюць ганаровыя жыхары горада, героі працы.

Здесь на рассвете в золотых лучах
Купали росы первую палатку,

И первый камень в первых кирпичах
Застыл навеки в нерушимой кладке.

Гэта вершы Сяргея Сакалова, рабочага ВА «Палімір», які ўслед за прадстаўнікамі старэйшага пакалення расказвае аб сучасным Наваполацку, аб яго працоўным рытме, аб яго прыгажосці.

...Пласцінка зрабіла апошні паварот і спынілася. Але апавяданне не абарвалася. Яго працягвае мой субяседнік — сам Сяргей, зараз слухач падрыхтоўчага аддзялення БДУ.

З Наваполацкам у хлопца звязаны лепшыя ўспаміны, і вершы пісаць ён пачаў іменна ў гэтым горадзе.

Першы свой твор напісаў яшчэ ў другім класе і прысвяціў яго У. І. Леніну. З таго часу захапленне паэзіяй не пакідае Сяргея. Пісаў для сябе, для душы. У дзесятым класе, удзельнічаючы ва Усесаюзным конкурсе сачыненняў на тэму «Ленін з намі», прысвечаным 50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна, Сяргей вырашыў напісаць вершаванае сачыненне. Вынік быў нечаканы і вельмі прыемны: яго праца была ўдастоена дыплома другой ступені.

На поспехі пачынаючага паэта звярнулі ўвагу ў раённым літаратурным аб'яднанні «Наддзвінне», запрасілі наведваць пасяджэнні клуба. Сустрэчы з паэтамі-прафесіяналамі, размовы аб паэзіі, аналіз твораў зрабілі вялікі ўплыў на юнака. Сяргей стаў больш удумліва выбіраць тэмы сваіх вершаў, больш крытычна падыходзіць да іх. На старонках раённай газеты «Сцяг камунізму» і гарадской газеты «Хімік» пачалі паяўляцца лепшыя вершы Сакалова.

Асабліва цікавай і плённай была праца Сяргея ў секцыі паэзіі пры творчым аб'яднанні «Крыніцы». Тэма Радзімы, веліч роднага краю, прыгажосць беларускай прыроды асабліва захапілі Сяргея. Ён успамінае, што з самага дзяцінства бацькі вучылі яго любіць Радзіму, родную беларускую мову. Асабліва вялікі ўплыў на Сяргея зрабілі добрыя сябры сям'і вядомы беларускі празаік Янка Брыль і паэт Мікола Хведаровіч.

Шырокую вядомасць у родным горадзе Сяргей набыў тады, калі прыняў удзел у якасці вядучага ў канцэртных праграмах вакальна-інструментальнага ансамбля «Колеры». У 1974 годзе ансамбль дэбютаваў у конкурсе вакальна-інструментальных ансамбляў у горадзе Даўгаўпілсе (Латвія). Нягледзячы на сур'ёзную канкурэнцыю, «Колеры» занялі другое месца, уступіўшы толькі вядомаму ансамблю «Добры молодцы». Кампетэнтнае журы прысудзіла ансамблю спецыяльны прыз за цэласнасць канцэртнай праграмы. Безумоўна, у гэтым была вялікая заслуга семнаццацігадовага Сяргея, які к таму часу напісаў ужо некалькі песень для ВІА «Колеры».

Скончыўшы школу, Сяргей вырашыў паступаць на філфак БДУ, каб ажыццявіць сваю даўнюю мару — стаць настаўнікам беларускай мовы. Але не прайшоў па конкурсу. Пайшоў працаваць, потым служба ў арміі—гэтыя два гады яшчэ больш надалі хлопцу ахвоты вучыцца далей. Улічваючы, што шмат забылася, што патрабуецца сур'ёзная работа, Сяргей вырашыў паступіць на падрыхтоўчае аддзяленне.

Нягледзячы на сціпласць студэнцкага жыцця, у пакоі Сакалова звяртае на сябе ўвагу аб'ёмістая бібліятэка. Адчуваецца, што яе гаспадар—страсны кнігалюб. Сяргей мне расказваў, што ў іх дамашняй бібліятэцы каля 5000 кніг. Сярод іх шмат з аўтографамі сучасных беларускіх пісьменнікаў. Некаторыя з іх Сяргей атрымаў на розных конкурсах. Вось, напрыклад, двухтомнік В. Быкава Сакалоў атрымаў, заняўшы першае месца ў конкурсе маладых паэтаў г. Наваполацка.

У апошні час Сяргей усё больш пачаў захапляцца гістарычным мінулым беларускага народа. Адзін з яго апошніх твораў—балада, прысвечаная беларускай асветніцы XII стагоддзя Ефрасінні Полацкай. Аўтар паказвае нам той час, калі лёс звёў трох вялікіх людзей: Ефрасінню, дойліда Іаана, збудаваўшага цудоўны Спаса-Ефрасіньеўскі манастыр, і вядомага полацкага ювеліра Лазара Богшу, зрабіўшага унікальны крыж для Ефрасінні. Тэмай балады з'яўляецца паказ барацьбы беларускага народа, яго лепшых сыноў і дачок за сваю светлую будучыню, пратэст супраць дэспатычнай улады князя.

Мы бачым уперадзе чыстыя росы,
Там людзі смяюцца, ніхто не галосіць,
І белыя, русыя ў іх валасы,
На белай зямлі там растуць каласы.
Уволю там шчасця, уволю там хлеба.
Уволю ўсяго, і бяры, чаго трэба.

У канцы нашай размовы я спытаў аб планах на будучае. Сяргей усміхнуўся:

— Пісаць, пісаць і пісаць. Толькі ва ўпартай, карпатлівай працы можна дабіцца поспеху, знайсці сваю творчую лінію, здолець прыносіць шчасце людзям.

А. ДАБРЫЯН,
слухач падрыхтоўчага аддзялення.

Васіль Іванавіч Сцяпанаў

22 мая 1979 года пасля цяжкай хваробы памёр член КПСС з 1924 года, вядомы савецкі вучоны, член-карэспандэнт АН БССР, доктар філасофскіх навук, прафесар, загадчык кафедры філасофіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна Васіль Іванавіч Сцяпанаў.

В. І. Сцяпанаў нарадзіўся ў 1903 годзе ў в. Залатое Саратаўскай вобласці у сям'і саматужніка. З юнацкіх гадоў ён звязаў свой лёс з камсамолам, ленінскай партыяй, актыўна ўдзельнічаў у абароне заваёў рэвалюцыі на франтах грамадзянскай вайны.

У 1929 годзе В. І. Сцяпанаў накіроўваецца ў Акадэмію камуністычнага выхавання імя Н. К. Крупскай, пасля заканчэння якой быў пакінут для прадаўжэння вучобы ў аспірантуры. У 1935 годзе ён абараніў кандыдацкую дысертацыю, і з гэтага часу яго працоўная дзейнасць пачалася ў вышэйшай школе краіны. Ён працуе дацэнтам, загадчыкам кафедры, дэканам Сталінградскага, Бірскага педінстытутаў, а з 1947 года—у Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна.

У гады Вялікай Айчыннай вайны В. І. Сцяпанаў служыў у радах дзеючай арміі, а затым у саставе групы савецкіх войск у Германіі.

Шырокая навуковая эрудыцыя Васіля Іванавіча Сцяпанава, яго высокая партыйнасць, чалавечая дабрата і ўвага да людзей заваявалі яму заслужаны аўтарытэт вопытнага педагога, даследчыка і выхавацеля моладзі. Пад яго кіраўніцтвам падрыхтаваны 4 дактары і больш 30 кандыдатаў навук. Ім апублікаваны буйныя працы ў галіне філасофіі і дыялектыка-матэрыялістычнай тэорыі пазнання агульным аб'ёмам звыш 90 друкаваных аркушаў, у тым ліку манаграфія «Філасофскія і сацыялагічныя погляды В. Р. Бялінскага». У 1967 годзе ён быў выбран членам-карэспандэнтам АН БССР.

Васіль Іванавіч шмат часу аддаваў грамадска-палітычнай рабоце. Больш дваццаці гадоў ён з'яўляўся членам рэдкалегіі часопіса «Коммунист Белоруссии», быў членам рэдакцыйнага савета і навуковым кансультантам 12-томнай Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, галоўным рэдактарам раду навуковых работ. Ён быў палымяным прапагандыстам марксісцка-ленінскай філасофіі, актыўным лектарам таварыства «Веды».

Партыя і ўрад высока ацанілі ратныя і працоўныя заслугі В. І. Сцяпанава. Ён узнагароджан ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Чырвонай Зоркі», чатырма медалямі, Ганаровай граматай і Граматай Вярхоўнага Савета БССР. У 1977 годзе яму было прысвоена званне заслужанага дзеяча навукі Беларускай ССР.

Светлая памяць пра Васіля Іванавіча Сцяпанава як перакананага камуніста, вядомага філосафа, чалавека маральнай чысціні, шчырага, добразычлівага таварыша будзе жыць у сэрцах тых, хто ведаў яго і працаваў разам з ім.

Ідуць практычныя заняткі па оптыцы ў другакурснікаў фізфака. Каля дошкі студэнт Уладзімір СТАЛПОЎСКІ.

Фота М. Дубовіка.

Савет прафілактыкі лічыць...

У маі ў Белдзяржуніверсітэце адбылося чарговае пасяджэнне савета прафілактыкі правапарушэнняў. Разглядалася пытанне аб стане і эфектыўнасці барацьбы з п'янствам.

Праведзены саветам аналіз паказвае, што ў параўнанні з 1977 годам колькасць правапарушэнняў, зробленых супрацоўнікамі і студэнтамі, хоць некалькі і паменшылася, але прадаўжае заставацца на даволі высокім узроўні. У 1978 годзе органамі ўнутраных спраў горада Мінска былі затрыманы 22 супрацоўнікі і 40 студэнтаў універсітэта, якія знаходзіліся ў стане ап'янення.

Нельга сказаць, што ў адносінах да парушальнікаў не прымяняюцца ніякія меры ўздзеяння. Толькі ў мінулым годзе за п'янства былі выключаны з універсітэта 7 студэнтаў, яшчэ 17 студэнтам вынесена строгая вымова. Савет прафілактыкі адзначыў, аднак, што меры, прынятыя ў адносінах да значнай часткі парушальнікаў, не атрымліваюць неабходнай агалоскі. Паведамленні аб мерах уздзеяння рэдка паяўляюцца на старонках факультэцкага насценнага друку, не даводзяцца да ведама супрацоўнікаў і студэнтаў факультэтаў. Часам аб прынятых мерах не ведаюць нават сакурснікі парушальнікаў. Зразумела, што недастатковы ўзровень галоснасці значна зніжае выхаваўчае значэнне прымаемых мер як у адносінах да саміх парушальнікаў, так і да ўсіх астатніх супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта.

Існуе яшчэ адна праблема, вырашэнне якой дазволіла б палепшыць работу па зніжэнню правапарушэнняў ва універсітэце. Размова ідзе аб стане антыалкагольнай прапаганды. У 1978 годзе саветам прафілактыкі быў арганізаван цыкл лекцый у студэнцкіх інтэрнатах на тэмы: «Крымінальна-прававыя, адміністратыўна-прававыя і грамадска-прававыя меры барацьбы з п'янствам і алкагалізмам», «Алкаголь — вораг здароўя чалавека» і іншыя. Аднак на большай частцы лекцый прысутнічала вельмі мала студэнтаў, былі выпадкі зрыву лекцый.

Патрэбна актывізаваць барацьбу з п'янствам. Савет прафілактыкі лічыць, што паменшыць колькасць правапарушэнняў можна з дапамогай некаторых мер, сутнасць якіх зводзіцца да наступнага. Неабходна дабіцца такога стану, пры якім ні адзін выпадак п'янства не заставаўся б невядомым грамадскасці. У насценным друку факультэтаў і іншых падраздзяленняў універсітэта трэба паведамляць аб усіх мерах, прынятых у адносінах да парушальнікаў. Шырэй выкарыстоўваць у гэтым плане «Камсамольскі пражэктар». Патрэбна актывізаваць антыалкагольную прапаганду. Для гэтага ў нас ёсць вялікія магчымасці, бо чытаць лекцыі, праводзіць гутаркі на гэтыя тэмы могуць не толькі супрацоўнікі суда і пракуратуры горада Мінска, але і выкладчыкі, а таксама студэнты старэйшых курсаў юрыдычнага факультэта.

У адным з бліжэйшых нумароў «Беларускага універсітэта» будуць прыведзены параўнаўчыя даныя аб колькасці правапарушэнняў па асобных факультэтах і падраздзяленнях універсітэта. Публікацыя такіх даных дазволіць супрацоўнікам і студэнтам універсітэта актыўней уключыцца ў агульную справу барацьбы за прадухіленне правапарушэнняў ва універсітэце.

В. УХВАНАЎ,
член савета прафілактыкі.

ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА

Акрамя летняй сесіі, універсітэцкім спартсменам прыйдзецца здаваць яшчэ і спартыўныя экзамены. Адным з такіх экзаменаў быў лёгкаатлетычны вясновы крос, другі — першынство універсітэта па лёгкай атлетыцы.

Першымі на дарожкі стадыёна выйшлі бегуны на кароткія дыстанцыі. Мала хто сумняваўся ў перамозе студэнта біялагічнага факультэта Дзмітрыя Гілевіча ў забегу на 100 м. Яго вынік 10,7 сек.

У жанчын на гэтай дыстанцыі перамагла Святлана Янушкевіч — 12,9 сек. Лепшая наша бягуння Ірына Чурсіна не выступала. Цяпер яна рыхтуецца да спартакіяды народаў СССР у саставе зборнай рэспублікі.

Героем спартыўнага свята па праву можна лічыць студэнта гістарычнага факультэта Сяргея Версана. Ён перамог адразу на дзвюх дыстанцыях. У пачатку С. Версан выйграў забег на 200 м з выдатным часам — 23,0 сек., а праз некалькі хвілін перамог на дыстанцыі 400 м — 50,0 сек. Выдатнае выступленне Сяргея дазволіла камандзе гістарычнага факультэта перамагчы адразу ў дзвюх эстафетах: 4×100 м — 45,7 сек. і 800×400×200×100 м — 3,28,8 мін.

Па іншых відах спартыўнай праграмы патрэбна адзначыць вынік студэнта мехмата Міхаіла Пыжа на 800 м — 1,54,9 мін. Усяго 0,5 секунды не хапіла яму для таго, каб устанавіць новы рэкорд універсітэта.

Добра выступіў студэнт фізічнага факультэта В. Квач. Як і С. Версан, ён перамог на дзвюх дыстанцыях: 1500 м — 3,55,4 мін. і 5000 м — 15,43,3 мін.

Па выніках спаборніцтваў упэўненую перамогу атрымала каманда гістарычнага факультэта — 421 ачко. На другім месцы каманда мехмата — 317 ачкоў і на трэцім — ФПМ — 271 ачко.

На жаль, не ўсе факультэты прынялі актыўны ўдзел у спаборніцтвах. Так, філалагічны факультэт зусім не выставіў сваю каманду. Адсюль і вынік — традыцыйнае апошняе месца. Недалёка ад філфака адышоў геаграфічны факультэт і факультэт радыёфізікі і электронікі. Восьмае месца, як і ў мінулым годзе, заняў факультэт журналістыкі. А чаму? Справа тут не ў тым, што на факультэце няма спартсменаў, яны ёсць, але вось няма патрэбнай арганізацыі. Каманду «састаўлялі» толькі ў час спаборніцтваў.

А. ВЕРУШ.

Валянціна ЖУКОЎСКАЯ (мехмат) — пераможца ў бегу на 400 і 800 метраў.

Старт забегу на 1000 м.

Фота **М. Касяка.**

Маршрутамі славы

Адным з напрамкаў работы СБА з'яўляецца ўдзел у экспедыцыі «Мая Радзіма — СССР». Байцы наведваюць музеі, выстаўкі беларускай сталіцы, арганізуюць экскурсіі па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа.

Вось і нядаўна байцы СБА імя Ленінскага камсамола прайшлі па маршруту Мінск — Жодзіна — Барысаў — Крупкі — вёска Белае — Мінск. Будатрадаўцы наведалі Курган Славы, помнік Н. Т. Купрыянаваў у Жодзіне, помнік С. Арджанікідзе ў Барысаве.

Цікавая сустрэча адбылася ў другой сярэдняй школе г. п. Крупкі. Члены лектарскай групы выступілі перад школьнікамі з лекцыяй «БАМ — будоўля века». Атрадная агітбрыгада дала невялікі канцэрт. Гарачымі апладысментамі былі сустрэты выступленні Ірыны Піўчанкі, Уладзіміра Дзюбы, Вольгі Гашынай.

Экскурсавод школьнага музея Оля Аніскавец правяла студэнтаў па залах музея, экспазіцыя якога прысвечана гераічнаму подзвігу Героя Савецкага Саюза А. Ф. Колесаваў, чыё імя носіць школа. З г. п. Крупкі аўтобус узяў кірунак на вёску Белае — радзіму лётчыка-касманаўта СССР, Героя Савецкага Саюза, ганаровага байца атрада Уладзіміра Васільевіча Кавалёнка. Байцы атрада сустрэліся з маці і бабуляй касманаўта Вольгай Іванаўнай і Ульянай Уладзіміраўнай. Будатрадаўцы пазнаёмілі родных ганаровага байца са сваім атрадам, падарылі набор фотаздымкаў з будоўляў БАМа. Вольга Іванаўна і Ульяна Уладзіміраўна расказалі пра У. В. Кавалёнка, адказалі на шматлікія пытанні, пажадалі байцам СБА ўдарнага працоўнага лета, выдатных поспехаў у вучобе.

Л. ПРАНЧАК.

Што за словам?

Галоўным сродкам зносін з'яўляюцца мова, чалавечае слова. І па таму, як валодае чалавек гэтым сродкам, нярэдка робяць вывады аб яго культуры.

...Ідзе абарона дыпломнага праекта выпускніка Сяргея С. Граматна выкананыя, выразныя чарцяжы. Пачка папер з табліцамі і разлікамі. І — парадокс!—незразумелая мова, трафарэтныя фразы будучага інжынера — чалавека, які заўтра прыйдзе ў цэх, на ўчастак да працоўных.

Зносіны людзей павінны быць не толькі разумнымі і правільнымі. Яны павінны быць яшчэ і прыгожымі!

Вось аўтобусны эпізод. На сядзенні ля акна размясцілася маладая, з тонкімі рысамі твару, прыгожа апранутая студэнтка-першакурсніца. Нельга не залюбавацца юным, прыгожым тварам. На наступным прыпынку дзяўчына паднялася, каб выйсці, але яе пажылая суседка крыху замешкалася. І раптам цішыню аўтобуса парушыў прарэзлівы візглівы голас:

— Аслепла, ці што? Расселася, не пройдзеш!

Красавіца выйшла, і зачараванне рассеялася. Яно знікла хутчэй, чым пах яе тонкіх духоў. Грубыя і злыя словы, вульгарны голас выдалі нявыхаванасць.

Мы жывём у век вялікіх скарасцей, высокага тэмпу, мноства інфармацыі. Пад уплывам такога рытму нярэдка раздражняешся. Грубасць у такіх умовах можа распаўсюдзіцца, як інфекцыя. Але ніякія тэмпы века не апраўдваюць студэнта (як і выкладчыка), які з цыгарэтай у зубах і рукамі у кішэнях кідае на хаду старэйшаму таварышу або калегу: «Драссьце!» або, напрыклад, вядзе дыялог (я яго не прыдумала, а пачула) у такім духу:

— Як жыццё?

— Б'е ключом. І ўсё па галаве.

— Колька прасіў зайсці.

— Як жа! Спяшаюся і падаю.

Нярэдка нашы студэнты гавораць брыдкія словы.

Чалавек, які атрымаў здаровае выхаванне, ведае сапраўдны кошт яркаму і вобразнаму слову, ніколі не апаганіць сваю мову. Брыдкія словы прыжываюцца толькі там, дзе прарастае бескультур'е, калі губляецца пачуццё грамадзянскай адказнасці за словы і справы. Брудныя слова ёсць непафарбаваная і дзяшовая гадасць.

Культура паводзін савецкага чалавека заўсёды і ўсюды павінна быць на ўзроўні прагрэсу, які нясе ў сабе наша сацыялістычнае грамадства.

В. ФІСУН.

Галоўнае—увага

Лісток ДАІ

Набліжаецца лета—разгар аўталюбіцельскага сезона. З кожным добрым вясновым днём усё больш ажыўлена становіцца на станцыях аўтатэхабслугоўвання, у аўтамагазінах, раскрываюцца вароты гаражоў індывідуальных уладальнікаў.

Але вясна нясе і шэраг спецыфічных асаблівасцей. Па-першае, за зіму значна забыты правілы дарожнага руху, а з улікам змен у іх на 1 студзеня 1979 года вельмі нялішне будзе іх уважліва вывучыць. Дарэчы, вучонымі даказана, што правілы, калі іх вывучыць, але не прымяняць у дзеянні, за адзін год забываюцца напалову.

Было б таксама вельмі карысна вывучыць прадстаячыя змены і дапаўненні да дарожных знакаў і ўказальнікаў, якія, як вядома, уводзяцца ў СССР з 1 студзеня 1980 года. Часопіс «За рулём» ужо дае такую публікацыю для шырокага кола чытачоў.

Па-другое, вялікае значэнне мае тэхнічны стан транспартных сродкаў, і галоўнай сваёй задачай у гэтым плане аўтаматалюбіцелі павінны лічыць падрыхтоўку транспарту да тэхагляду-79.

Як і раней, вялікую дапамогу ў тэхнічным аглядзе закліканы аказаць работнікам ДАІ дружыннікі-аўтаінспектары і актыў таварыства аўтамотааматараў.

Трэба падкрэсліць, што з 1 студзеня 1979 года па 31 снежня 1979 года ў СССР праводзіцца Усесаюзны агляд работы па забеспячэнню бяспекі руху. Высокая свядомасць і дысцыпліна на транспарце і дарогах—важнейшы і найпершы абавязак як вадзіцеляў, так і пешаходаў у гэты перыяд.

Заслугоўвае адабрэння ініцыятыва Беларускага таварыства аўтамотааматараў па стварэнню куткоў па бяспецы руху пры гаражных калектывах і пярвічных арганізацыях таварыства. Гэта былі б свайго роду апорныя пункты аўтамабільнага правапарадку ў горадзе. Для абсталявання такіх куткоў бяспекі руху гарадскі штаб ДНД пры ДАІ выдзеліў матэрыял для наглядней агітацыі. У далейшым з дапамогай раённых саветаў таварыства і ДАІ горада можна было б штомесяц інфармаваць членаў таварыства аб стане аварыйнасці на транспарце, аднаўляць плакатны матэрыял, набываць неабходную літаратуру.

Такія куткі бяспекі руху маглі б пры адпаведных умовах служыць і вучэбнымі класамі для невялікай аўдыторыі вадзіцеляў-слухачоў, якія жадаюць папоўніць і асвяжыць у памяці Правілы вулічнага руху.

Нарэшце хацелася б напомніць і статыстыку. У 1978 годзе ў Мінску аўтамотаамаратарамі здзейснена 200 дарожна-транспартных здарэнняў, пры гэтым 7 чалавек загінула, 192 паранены. Трэба заўважыць, што 25 здарэнняў былі зроблены вадзіцелямі ў стане ап'янення. У параўнанні з 1977 годам у мінулым годзе колькасць уладальнікаў, якія вадзілі асабісты транспарт у стане алкагольнага ап'янення, узрасла на 36,4 працэнта.

Усё яшчэ часта парушаюцца патрабаванні Правілаў, якія датычаць уважлівых адносін да пешаходаў. Так, у мінулым годзе было зроблена 109 наездаў на пешаходаў, з якіх трое загінулі, а 106 паранены. Трэба памятаць, што пешаходамі бываем мы ўсе, і ўвага ў гэтым выпадку неабходна.

М. РАБЫ,
супрацоўнік ДАІ УУС Мінгарвыканкома.

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Заказ № 853. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. АТ 00143